Веcткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamleńni

Сусьветнае сеціва: *e-krama.com, pahonia.com*
Электронны адрас: *viestki@mail.com*
✉ *P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735*

№ 8 (606)
Жнівень 2016 г.

Марш Паняволеных Народаў і сход “Пагоні”

У нядзелю 17 ліпеня 2016 года ў Нью-Ёрку прайшоў Марш Паняволеных Народаў. Гэтая імпрэза, якая сёлета адбылася ў 58-ы раз, праводзіцца штогод у рамках Тыдня Паняволеных Народаў, што быў усталяваны ў 1959 годзе адмысловым урадавым законам, што быў падпісаны прэзыдэнтам Дўайтам Д. Айзэнгаўэрам. Праз імпрэзы Тыдню Паняволеных Народаў прадстаўнікі народаў і краінаў, што пацярпелі ад расейскага камунізму, выказвалі свой пратэст супраць тыраніі й акупацыі, а таксама праыцягвалі ўвагу амэрыканскай грамадзкасьці да становішча паняволеных камунізмам народаў. Таму на працягу дзесяцігодзьдзяў у трэці тыдзень ліпеня Нью-Ёрк рабіўся пляцоўкай для масавых дэманстрацыяў і публічных акцыяў арганізацыяў украінцаў, палякаў, латышоў, сэрбаў, чэхаў, венграў, славакаў, летувісаў ды іншых прадстаўнікоў краінаў Усходняй Эўропы, Азіі, Кубы якія апынуліся пад камуністычным панаваньнем. У рамках адмысловых імпрэзаў Тыдня былі такія акцыі, як пікеты каля савецкіх прадстаўніцтваў у Нью-Ёрку, Лёс-Анджэлясе й Вашынгтоне, дэманстрацыя Паняволеных Народаў у 1976 годзе каля Статуі Свабоды на 200-годзьдзе ЗША.

Падчас 30-годзьдзя Тыдня Паняволеных Народаў прэзыдэнт ЗША Рональд Рэйган сказаў наступныя словы: “Амэрыка ніколі не забудзецца на пакуты Паняволеных народаў па ўсім сьвеце, і мы ніколі не перастанем казаць праўду. Вашае змаганьне ёсьць і нашым змаганьнем. Вашая мара ёсьць і нашай марай. І неўзабаве вы зробіцеся вольныя.” І гэтыя прарочыя словы спраўдзіліся празь некалькі год, шматлікія паняволеныя народы вызваліліся ад камуністычнай навалы.

Цяперашні прэзыдэнт ЗША і амэрыканская адміністрацыя займаюцца замірэньнем ворагаў, саступаюць тыранам пазыцыю за пазыцыяй. Таму так важна, каб амэрыканскія людзі ведалі пра змаганьне праміналае і змаганьне цяперашняе, і ня менш важна, каб прадстаўнікі арганізацыяў, што прадстаўляюць у ЗША народы Эўропы, трымаліся разам, падтрымлівалі адзін аднаго, дзеялі ў адпаведнасьці са старадаўнім лёзунгам паўстанцаў 1863 году “За нашу і вашу свабоду!”

Беларускія арганізацыі заўсёды бралі актыўны ўдзел у падзеях Тыдня Паня-

закачэньне на бачыне 2



Марш Паняволеных Народаў і сход “Пагоні”

заканчэньне з бачыны 1

воленых Народаў, а ў апошнія 5 год Беларуска-Амэрыканскае Згуртаваньне “Пагоня”. На імпрэзе дамінавалі бел-чырвона-белыя сьцягі, якія прынесьлі сябры Згуртаваньня “Пагоні”, якое афіцыйна ўзяло ўдзел у Тыдні, што пачаўся Маршам Паняволеных Народаў.





Удзельнікі імрэзы сабраліся а 9-й гадзіне раніцы каля гатэлю “Пляза” пры 59-й вуліцы і 5-й авэню. Затым удзельнікі калёнаю па 5-й авэню пайшлі да Сабору сьв. Патрыка пры 51-й вуліцы, дзе адбылося асьвячэньне сьцягоў ды імша за Паняволеныя Народы й вызваленьне іх ад пост-камуністычнай тыраніі. Правіў імшу рэктар Катэдры сьв. Патрыка мансэнёр Робэрт Рычы. Перад імшою ён асьвяціў прынесеныя сьцягі.

Пасьля імшы ўдзельнікі імпрэзы прайшлі Маршам па 5-й авэню да 72-й вуліцы каля Цэнтральнага парку. Падчас Маршу гучэлі лёзунгі “Жыве Беларусь!”, Свабоду ўсім паняволеным народам!”, “Свабоду Беларусі!”. У Цэнтральным парку адбылося афіцыйнае адкрыцьцё Тыдня Паняволеных Народаў, якое пачаў уступным словам сп. Яан Куум, прадстаўнік эстонскай грамады і дзеючы старшыня Камітэту Паняволеных Народаў. Перад гэтым ён прамовіў клятву вернасьці сьцягу і прасьпяваў амэрыканскі гімн. Сп. Яан Куум затым выступіў з прамовай пра надзённасьць мерапрыемстваў Тыдня цяпер, калі штодня пагаршаецца міжнародная сытуацыя, расейскі агрэсар зьбірае сілы, краіны НАТО перанятыя нутраным крызісам Эўразьвязу.

Ад беларускай дэлегацыі выступіў старшыня Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня” сп. Віталь Зайка, які зрабіў націск на патрэбе салідарнасьці й супрацоўніцтва арганізацыяў выхадцаў з Усходняй Эўропы. “Свабода не даецца бясплатна”, “Свабода – гэта штодзённы рэфэрэндум” – на гэта ніколі ня можна забывацца, і прыклад таму, паўзучы наступ на дэмакратычныя інстытуты, які вядзе так званая “прагрэсіўная” псэўдалібэральная эліта ў амэрыканскім грамадзтве.

Наступным прамоўцам быў прадстаўнік польскіх арганізацыяў у Амэрыцы сп. Вітольд Разоўскі. Ён распавёў пра небясьпеку аднаўленьня расейскага імпэрыялізму і рэваншызму, з праявамі якога сутыкнуліся ўкраінцы, а цяпер мусяць лічыцца балты, палякі ды ўсе ўсходнеэўрапэйцы. Прамоўца прыпомніў змаганьне часоў барацьбы за свабоду супраць камуны і адзначыў, што гэта сапраўды дзіўна і непрыгожа, калі цяпер на акцыі Тыдню Паняволеных Народаў прыходзяць толькі прадстаўнікі тых народаў, каго праблемы тычацца непасрэдна – беларусы, кубінцы, віетнамцы і так далей. Па справядлівасьці, кожны вызвалены народ мусіў бы падаць руку тым, хто яшчэ застаюцца ў няволі. Сп. Разоўскі далей распавёў пра пагрозу лібэральнага ачмурэньня, ад якога церпіць Эўропа і Польшча, і якое таксама пашыраецца ў Злучаных Штатах. “Гэтаму таксама мусім супрацьстаяць разам”. Выступы былі з увагаю выслуханыя прысутнымі. Прамовы таксама прыцягвалі ўвагу адпачываючых у парку.

Пасьля адбыўся кароткі сход Згуртаваньня “Пагоня”, на якім сп. В. Зайка каратка пазнаёміў зь дзейнасьцю “Пагоні” тых асобаў, што ў першы раз прыйшлі на імпрэзу Згуртаваньня. Затым прагучэлі аб'явы і паведамленьне, што наступны сход 13 жніўня таксама пройдзе ў Цэнтральным парку.

Віталь ЗАЙКА

Вера Ры÷ - паэтка і прыяцелька Беларусі



Гэтай вясною, 24 красавіка, споўнілася 80 год ад нараджэньня выдатнай ангельскай перакладчыцы і вялікай прыяцелькі Беларусі, сяброўкі Англа-Беларускага Таварыства і Міжнароднай Асацыяцыі Беларусістаў, паэткі Веры Рыч (1936-2009).

Адукаваная ў Оксфардзе, Вера Рыч у маладыя гады пазнаёмілася зь беларусамі ў Вялікай Брытаніі й захапілася беларускай культурай, беларускім пісьменствам. Яна брала актыўны ўдзел у працы Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі (ЗБВБ), выступала ў ангельскіх пэрыёдыках з артыкуламі пра Беларусь. Славісты добра ведаюць ейныя пераклады зь беларускай, а таксама з украінскай моваў, артыкулы ў пеэрыёдыках “Times Higher Education Supplement”, “The Tablet”, “Science”, “Lancet”, “Index on Censorship” ды шматлікіх іншых.

Вера Рыч ня раз наведвала Злучаныя Штаты, сустракалася з прадстаўнікамі беларускай грамады Амэрыкі, і мела зь імі сталую лучнасьць.

Вера Рыч выдала ў 1971 годзе фундамэнтальную анталёгію беларускай паэзіі ў сваіх перакладах “Like Water, Like Fire” (Як вада, як агонь, George Allen and Unwin Ltd., London). Кніга, выдадзеная на замову ЮНЭСКО, была надрукаваная з нацыянальным гербам Пагоня на супэрвокладцы, што выклікала пратэсты савецкіх функцыянэраў. ЮНЭСКО паддалося ціску, і дызайн вокладкі быў зьменены, але надпіс з назваю кнігі атрымаўся бел-чырвона-белым, чаго Саветы не заўважылі. Пераклады Веры Рыч зь беларускай паэзіі па-ангельску застаюцца і сёньня высокім стандартам, які яшчэ ніхто не пераўзыйшоў. Сп-ня В. Рыч таксама выдала кнігі перакладаў з паэзіі Гаруна, Бядулі, іншых паэтаў. Надрукавала кнігу пра выяву гэбрая ў беларускай літаратуры. Друкавала таксама пераклады з польскай, украінскай, стараангельскай і старанарвэскай моваў.

Ніжэй падаем ейны пераклад славутага вершу Ўладзімера Дубоўкі (1900-1976) “О Беларусь, мая шыпшына...”:

O Bielarus, My Briar-Rose Cherished...

O Bielarus, my briar-rose cherished,
O leaf of green, O flower of red,
In the wild wind you shall not perish,
Nor choke, by rank weeds overspread.
For I, myself, shall be your petals,
I’ll pierce my heart upon the pikes
Of your dear eyes, the hue of metal,
The rays I love, burnished and bright.
Never shall the wild-blowing breezes
Unloose your maiden plaits so fair,
Through the world’s striving, you strive ceaseless.
That joy may blossom everywhere.
Foes shall not cause your path to perish,
In hardship is the spirit bred,
O Bielarus, my briar-rose cherished,
O leaf of green, O flower of red.

Для параўнаньня даем ніжэй Дубоўкаў арыгінал:

О Беларусь, мая шыпшына,
Зялёны ліст, чырвоны цьвет!
У ветры дзікім не загінеш,
Чарнобылем не зарасьцеш.
Пялёсткамі тваімі стану,
на дзіды сэрца накалю.
Тваіх вачэй – пад колер сталі –
Праменьне яснае люблю.
Ніколі пройме зь дзікім ветрам
не разьвіваць дзявочых кос.
Імкнесься да камуны Сьвету,
Каб радасьць красавала скрозь.
Варожасьць шляху не зачыніць:
У перашкодах дух расьце.
О Беларусь, мая шыпшына,
Зялёны ліст, чырвоны цьвет!

Віталь ЗАЙКА

Бясьпека Амэрыкі й небясьпека левых утопіяў

Некалі ў школе я дзівіўся, слухаючы настаўніцу савецкага грамадазнаўства, чаму амэрыканскія працоўныя ня скінуць буржуяў і капіталістаў і ня возьмуцца за пабудову камунізму? Згодна з тэорыямі клясыкаў марксізму-ленінізму, тады пабудова камунізму заняла б усяго некалькі год, а пасьля прыйшло б тысячагадовае цараваньне працоўных, эра справядлівасьці, вольнасьці й прагрэсу.



Часам мне ўзгаваюцца тыя адчуваньні дзяцінства, калі я чытаю або слухаю прамовы сёнешніх левалібэральных дзеячаў тут, у ЗША. Вяртаецца таксама з успамінаў ідэя пра стварэньне адмысловай незалежнай дзяржавы для цёмнаскурых амэрыканцаў, за якую зноў пачалі агітаваць прадстаўнікі “Новых Чорных Пантэраў”, чырвона-чорна-зялёныя сьцягі якіх залунаілі на мітынгах руху “Жыцьці чорных маюць вартасьць” (ЧЖМВ). Левалібэральная публіка, якая ўплывае на прыкладна палову амэрыканскага насельніцтва, лічыць, што справа пабудовы камунізму (можа пад іншымі рознымі найменьнямі) і падтрымка чорнага “вызвольнага руху” – справа годная, слушная і вартая падтрымкі.

Нажаль, тое, пра што гэтая публіка ня згадвае – гэта папярэднія спробы будовы гэных утопіяў, камуніс-

заканчэньне на бачыне 4

Бясьпека Амэрыкі й небясьпека левых утопіяў

заканчэньне з бачыны 3

тычнай і расава-незалежніцкай. Якія пекныя душы, якія прыгожыя памкненьні! Спакуса зрабіць усіх шчасьлівымі працягвае заваёўваць прыхільнікаў.

Аднак "прыгожыя душы" не згадваюць пра дзясяткі мільёнаў людзей у Эўропе і Азіі, якія заплацілі жыцьцямі за сацыяльныя і палітычныя экспэрымэнты марксістоўскіх, а таксама "пекнадушных" дзеячаў кшталту Леніна, Мао, Кастра, Пол Пота. Яны не ўспамінаюць чорны генацыд белых і мулатаў на Гаіці пачатку 19-га стагодзьдзя, калі вызваленыя Францускай рэвалюцыяй рабы аддзячылі французам, выразаўшы большасьць пад корань, а рэшту змусіўшы ўцякаць. Першая дзяржава вызваленых рабоў стала першым прыкладам пасьпяховай татальнай этнічнай чысткі – задоўга да Босьніі й Руанды. Менавіта гэта прыходзіць у галаву, калі глядзіш на бязглуздыя пратэсты студэнтаў, часта яшчэ падлеткаў, што праз маніпуляцыі дзеячаў кшталту Эла Шарптана, Джэсі Джэксана, і Луіса Фарагана з "Нацыі Ісламу" і за грошы фундацыі Сораса выходзяць на дэманстрацыі, патрабуючы раззбраеньня і ліквідацыі праваахоўчых установаў, выкрыкваючы вар'яцкія абвінавачаньні пра "белыя прывілеі", скандуючы "сьмерць белым паліцаям!", усьлаўляючы бындытаў і злачынцаў кшталту Т. Мартына, М. Браўна, і Ф. Грэя.



У падтрымку гэтага вар'яцтва выказаўся прэзыдэнт Б. Абама і чарнаскурыя генпракуроры Э. Голдар і Л. Лінч. А што грамадзтва? Грамадзтву фактычна забаранілі абмяркоўваць і выказвацца па пытаньнях расавых адносінаў. Пануе леваліберальная догма: чорныя апрыёры ні ў чым не вінаватыя; белыя апрыёры вінаватыя ва ўсім. "Адмаўляць гэта – значыць быць крывадушнікам, быць расістам!" Выглядае, што факты таксама могуць быць "расісцкімі". Вынікам усяго гэтага бязглуздзьдзя стала абсурдная сытуацыя, калі паліцаі пачалі хавацца ад злачынцаў. Узровень забойстваў, прыкладам, у Балтыморы падняўся на самы высокі за 35 год ўзровень.

Хто церпіць ад гэтай анархіі й усёдазволу? Перш за ўсё, тыя самыя чарнаскурыя амэрыканцы, за каго нібыта выступаюць афэрысты з ЧЖМВ. Бясьпека Амэрыкі пагаршаецца таксама празь бязглуздую іміграцыйную палітыку, ці лепш, адсутнасьць яе. Паўднёвая мяжа фактычна не існуе, і амаль кожны можа праз Мэксыку ўшчыміцца ў ЗША з чорнага ходу. Цяперашняя адміністрацыя імкнецца да канца Абамавай кадэнцыі заімпартаваць як найболей уцекачоў з Сырыі, а праверыць іхнае мінулае, па прызнаньні ЦРУ і ФБР, няма мажлівасьці. Вынік – пагоршаньне бясьпекі ЗША, шматлікія сьмерці амэрыканцаў ад рук нелегалаў, радыкалізаваных мусульманаў і падбухтораных ЧЖМВ афраамэрыканцаў. Прычына такога выніку досыць відавочная – левыя ўтопіі "сацыялізму", "дывэрсыфікаванасьці", "мультыкультуралізму".

Ідэі могуць забіваць, і гэтая старая ісьціна зноў і зноў будзе пацьверджаная трагічнымі паведамленьнямі з навінаў, пакуль грамадзтва не паспрабуе вызваліцца ад лявацкага псэўдаліберальнага ачмурэньня.

Віталь ЗАЙКА

Уплаты ў Згуртаваньне
Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíüí³:

А. Апановіч	60
С. Барысенка	60
В. Бітус	60
С. Гехт	60
З. Громік	60
А. Дзежыц	60
Я. Кобак	60
В. Красьнік	60
П. Панасевіч	60
А. Пашэнка	60
А. Рэўко	60
А. Сельвановіч	60
С. Скародзька	60

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113
Чэкі выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня "Пагоня"
Viktar Yedzinovich.

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

адбудзецца ў суботу **13-га жніўня 2016 года** на Мангэтане ў Цэнтральным парку.

Сход пройдзе на пагорку ля вялікага возера (*The Lake with Boating*) з чаўнамі (паляна знаходзіцца на поўнач ад *Terrace Drive* і на захад ад *The Mall at Bethesda Fountain*) ля вялікіх скалаў-валуноў.

ЗБОР а **10.30** раніцы ля ўвахода ў парк пры 5-й авэню і 72-й вуліцы.

Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, ладжаных Згуртаваньнем "Пагоня", можна даведацца, наведаўшы сайт ***pahonia.com***

Паважаная ***Натальля Матыс,*** *калі ласка, паведаміце рэдакцыі ваш дакладны паштовы адрас.*

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

А. Апановіч	30
С. Барысенка	30
В. Даніловіч	30
А. Громік	30
А. Дзежыц	30
Я. Кобак	30
П. Панасевіч	30
А. Пашэнка	30
А. Рэўко	30
А. Сельвановіч	30
С. Скародзька	30
А. Тырля	30
А. Харчэўка	30

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь можна даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*
Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735
Чэкі выпісвайце на імя скарбніка "Пагоні" ***Viktar Yedzinovich***.